# Геополитические трансформации в Восточной Европе между двумя мировыми войнами

## (К 90-летию подписания Рижского мирного договора)

Учреждение образования
«Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»

# Геополитические трансформации в Восточной Европе между двумя мировыми войнами

## *(К 90-летию подписания Рижского мирного договора)*

Сборник материалов
международной научно-практической конференции

Брест, 17–18 марта 2011 года

Брест
БрГУ имени А.С. Пушкина
2011

УДК 94(100)(82)+099.5
ББК 63.3(0)я43
Г 35

*Рекомендовано редакционно-издательским советом учреждения образования «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»*

*Рецензенты:*
кандидат исторических наук, профессор кафедры
социально-политических и исторических наук
УО «Брестский государственный технический университет»
**Н.Н. Ковалева**
кандидат исторических наук, доцент кафедры истории славянских народов
УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина»
**А.А. Савич**

*Редакционная коллегия:*
доктор исторических наук, профессор **М.Э. Чесновский** (гл. ред.)
кандидат философских наук, доцент **Н.П. Галимова**
кандидат исторических наук **В.Г. Швайко**
кандидат исторических наук **Т.М. Тохиян**
кандидат исторических наук, доцент **Е.И. Пашкович**
кандидат исторических наук, доцент **Е.С. Розенблат**

Г 35 **Геополитические** трансформации в Восточной Европе между двумя мировыми войнами. (К 90-летию подписания Рижского мирного договора) : сборник материалов междунар. науч.-практ. конф. ; Брест, 17–18 марта 2011 г. / Брест. гос. ун-т имени А.С. Пушкина ; редкол.: М.Э. Чесновский (гл. ред.) [и др.]. – Брест : БрГУ, 2011. – 297 с.
ISBN 978-985-473-800-0.

В материалах сборника исследователями Беларуси, Украины, России, Литвы рассмотрены проблемы международных отношений, национальной, конфессиональной и экономической политики в странах Восточной Европы между двумя мировыми войнами.

Издание адресовано научным работникам, ученым, преподавателям и студентам вузов, а также всем, кто интересуется актуальными проблемами исторической науки.

Ответственность за языковое оформление и содержание статей несут авторы.

**УДК 94(100)(82)+099.5**
**ББК 63.3(0)я43**

**ISBN 978-985-473-800-0**

© УО «Брестский государственный университет имени А.С. Пушкина», 2011

## Раздел 3.
## ФОРМИРОВАНИЕ НАЦИОНАЛЬНЫХ ГОСУДАРСТВ В ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЕ В 1920–1930-е гг.

УДК 94 (476) “1921/1939”

**А.М. Вабішчэвіч,** Беларусь, БрДУ імя А.С. Пушкіна

### НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА ПОЛЬСКІХ УЛАД У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.): ПРАВАВЫЯ І ТЭАРЭТЫКА-ІДЭАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ, ХОД РЭАЛІЗАЦЫІ І ВЫНІКОВАСЦЬ

Пасля ўваходжання заходнебеларускіх зямель у склад Польшчы паводле Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. польскія ўлады вымушаны былі пры выпрацоўцы і ажыццяўленні сваёй палітыкі ўлічваць нацыянальную і канфесіянальную структуру насельніцтва. Большасць там складалі беларусы – у першай палове 1920-х гг. іх было не менш 2 млн. 326,4 тыс. чалавек (61,5 %), а палякаў – 1 млн. 23,8 тыс чалавек (31,2 % [5, с. 17], а з улікам вернутых у Заходнюю Беларусь бежанцаў – 27 %). Іншыя нацыянальныя супольнасці былі ў меншасці ў параўнанні з беларусамі. Паводле П. Эберхардта, на заходнебеларускіх землях у 1931 г. пражывала 352,7 тыс. яўрэяў (9,4 %), 90,1 тыс. рускіх (2,4 %), 49,5 тыс. украінцаў (1,2 %), 76 тыс. літоўцаў (2 %) [8, с. 52]. На дзяржаўным узроўні беларусаў прызнавалі меншасцю, рознымі сродкамі змяншалі колькасныя паказчыкі. Для павелічэння колькасці палякаў у іх склад наўмысна залічвалася значная частка беларусаў-католікаў, польскамоўных жыхароў, выкарыстоўваліся разнастайныя сродкі фальсіфікацыі вынікаў перапісаў. Да беларусаў не залічваліся “тутэйшыя”, у якіх не быў завершаны працэс фарміравання нацыянальнай свядомасці.

Прававую аснову для наладжвання нацыянальна-культурнага жыцця розных этнасаў у межах Польшчы складалі яе міжнародныя абавязацельствы, прынятыя ў рамках сістэмы адпаведных дагавораў Версальскай сістэмы і пасля завяршэння савецка-польскай вайны 1919–1920 гг., а таксама ўнутранае заканадаўства. Гарантыі ў галіне культуры і асветы былі прадугледжаны Дагаворам аб абароне нацыянальных меншасцей (Малым Версальскім трактатам), падпісаным польскім урадам 28 чэрвеня 1919 г., які ўтрымліваў як агульныя палажэнні, так і канкрэтныя абавязацельствы ў сферы нацыянальна-культурнага жыцця [11; 12]. Аднак Малы Версальскі трактат усё-такі не змог даць поўных гарантый з-за недакладнасцей і неадназначнай трактоўкі асобных палажэнняў, адсутнасці дзейснай сістэмы ўздзеянняў пры парушэннях. Недасканаласць Версальскай сістэмы не дазволіла наладзіць эфектыўны механізм абароны нацыянальных меншасцей на міжнародным узроўні.

Умовы Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. таксама гарантавалі нацыянальнае раўнапраўе, свабоду развіцця культуры, мовы, стварэння таварыстваў [14, с. 822]. Адпаведныя юрыдычныя нормы

гарантаваліся і ўнутраным заканадаўствам Польшчы. Канстытуцыя 1921 г. выключала любую дыскрымінацыю па падставе адметнасцей культуры, веравызнання, мовы, дэкларавала ўсім нацыянальным супольнасцям роўныя правы з палякамі пры адкрыцці за ўласны кошт розных адукацыйных, грамадскіх і іншых устаноў, свабоднае выкарыстанне ў іх нацыянальных моў, рэлігійнай практыкі (артыкулы 108–111) [10]. Правы нацыянальных меншасцей былі замацаваны і канстытуцыяй Польшчы 1935 г. [13].

Тэорыя і практыка ажыццяўлення дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі ў Польшчы была адрознай ад яе дагаворна-канстытуцыйных абавязацельстваў, якія пад уплывам цэлага шэрагу геапалітычных, сацыяльна-эканамічных, культурна-гістарычных і іншых фактараў ужо ў пачатку 1920-х гг. уступілі ў супярэчнасць з працэсам аднаўлення і станаўлення дзяржаўнасці Польшчы, з асноўнымі канцэпцыямі яе ўладкавання – інкарпарацыйнай і федэралістычнай (федэрацыйнай). Вялікадзяржаўная ідэя аднаўлення Рэчы Паспалітай, што ўтрымлівалася ў сфармуляванай нацыянал-дэмакратамі (эндэкамі) канцэпцыі інкарпарацыі [2, с. 17–18], знайшла шырокае адлюстраванне ў свядомасці большасці польскага грамадства. На наш погляд, у справе вырашэння нацыянальна-культурных праблем насельніцтва Заходняй Беларусі з польскага боку былі прадстаўлены 4 асноўныя праекты: нацыянал-дэмакратычны, кансерватыўны, ліберальна-дэмакратычны, камуністычны.

Нацыянал-дэмакратычны праект распрацоўваўся эндэкамі і іншымі правымі польскімі аб'яднаннямі ў кантэксце інкарпарацыйных планаў дзяржаўнага ўладкавання. Да яго звяртаўся і лагер пілсудчыкаў. Абсалютная большасць палякаў і польскай палітычнай эліты разглядалі Польшчу ў якасці выключна нацыянальнай дзяржавы. Прызнанне і абсалютызацыя мананацыянальнага (польскага) характару дзяржавы пазбаўляла магчымасці паўнацэннага ўдзелу прадстаўнікоў няпольскага насельніцтва (найперш беларускай большасці) у грамадскім жыцці. Эндэкі прадстаўлялі польскую культуру ў якасці вышэйшай, цывілізаванай, пагардліва сцвярджалі аб ніжэйшасці ўкраінцаў, беларусаў, таму выступалі за іх нацыянальна-культурную асіміляцыю гвалтоўнымі метадамі. Прапагандавалася спрошчанае ўяўленне пра беларусаў, якія мелі слабы ўзровень нацыянальнай свядомасці і схільнасць да асіміляцыі з боку іншых этнасаў. Нацыянал-дэмакратычны праект прадугледжваў антыдэмакратычны падыход і пры вырашэнні праблем яўрэяў, якіх неабходна было ізаляваць ад грамадскага жыцця. Так як яўрэі прызнаваліся эндэкамі прыналежнымі да іншай (чужой) цывілізацыйнай плыні, то большасць іх нельга было асіміляваць. Ажыццяўленне нацыянал-дэмакратычнага праекта адмаўляла няпольскаму насельніцтву права на свабоднае нацыянальна-культурнае развіццё.

Кансерватыўны праект прадугледжваў паступовыя, памяркоўныя метады нацыянальнай асіміляцыі няпольскага насельніцтва. Ідэолагі віленскіх кансерватараў (С. Цат-Мацкевіч і інш.) разглядалі дзяржаўную асіміляцыю ў якасці першага істотнага кроку ў напрамку дэнацыяналізацыі ўкраінцаў, беларусаў. Выступаючы за быццам прыязныя, талерантныя адносіны да ўсходнеславянскіх супольнасцей (беларусаў, украінцаў), літоўцаў, за іх

паступовую (“ступенчатую”, “памяркоўную”) асіміляцыю, віленскія кансерватары тым не менш падвяргалі крытыцы нацыянальную палітыку Польскай дзяржавы першай паловы 1920-х гг., адказнасць за якую ўскладвалі на эндэкаў. На іх думку, гвалтоўныя праявы польскага нацыяналізму маглі толькі запаволіць асіміляцыйныя працэсы [2, с. 20]. Наогул, кансерватыўны праект не знайшоў шырокай падтрымкі польскага грамадства і яго палітычных структур. Асобныя тэарэтычныя палажэнні кансерватараў былі часова выкарыстаны ў практычнай рэалізацыі нацыянальнай палітыкі, асабліва пасля майскага (1926 г.) дзяржаўнага перавароту ў Польшчы.

Ліберальна-дэмакратычны праект, якога прытрымліваліся нешматлікія народніцкія, ліберальныя і сацыялістычныя партыі і аб’яднанні, частка мясцовай польскай інтэлігенцыі, дэманстраваў прыхільнае стаўленне да ідэй тэрытарыяльнай аўтаноміі ўкраінцаў і беларусаў, адмаўляў антысемітызм і нацыянальную дыскрымінацыю. Значная частка яго тэарэтычных пастулатаў укладвалася ў кантэкст федэрацыйнай ці краёвай канцэпцый дзяржаўнага ўладкавання, нярэдка ўтрымлівала элементы тэорыі рэгіяналізму, якая прызнавала існаванне асобных этнічных культур у якасці лакальных праяў агульнапольскай культуры. “Краёўцы” не адмяжоўваліся ад Польшчы, аднак падкрэслівалі адрознасць нацыянальна-культурнага жыцця заходнебеларускіх зямель. Адзін з відных прадстаўнікоў ліберальна-дэмакратычнага праекта Л. Васілеўскі рэкамендаваў больш поўна ўлічваць культурныя і сацыяльна-эканамічныя інтарэсы беларусаў і іншых няпольскіх супольнасцей, хоць і лічыў іх грамадзянамі другой катэгорыі ці грамадзянамі, якія павінны былі выконваць перад Польскай дзяржавай пэўныя абавязкі. Хоць беларусы і ўкраінцы заслугоўвалі тэрытарыяльнай аўтаноміі, яўрэі – культурнай аўтаноміі [6], аднак беларусы ўяўляліся яму супольнасцю са слабым узроўнем нацыянальнай свядомасці, грамадска-палітычнай актыўнасці. Выступаючы супраць планаў эндэкаў адносна фарсіраванай паланізацыі заходнебеларускага насельніцтва, ён падтрымліваў планы дзяржаўнай асіміляцыі. Асобныя з яго прапаноў былі ўлічаны ў першыя гады дзейнасці рэжыму “санацыі” Ю. Пілсудскага. Аднак нягледзячы на пэўныя ліберальныя ўступкі няпольскаму насельніцтву, для Л. Васілеўскага і іншых ідэолагаў ліберальна-дэмакратычнага праекта першаснымі з’яўляліся інтарэсы забеспячэння польскай дзяржаўнасці [9, с. 52–62].

У камуністычным праекце перавага надавалася класавым (сацыяльным) інтарэсам ў параўнанні з нацыянальнымі, асуджалася нацыянальная палітыка польскіх улад, прызнаваліся правы няпольскага насельніцтва. Адзіным сродкам вырашэння нацыянальнага пытання прызнавалася пралетарская рэвалюцыя. Польскія камуністы выступалі за права Заходняй Беларусі на самавызначэнне і ўз’яднанне яе з БССР, што было зафіксавана на II з’ездзе Камуністычнай рабочай партыі Польшчы ў верасні 1923 г. [4, с. 23]. Урадавыя структуры Польшчы, большасць польскай палітычнай эліты не маглі дапусціць ажыццяўлення такіх радыкальных пераўтварэнняў.

Ва ўмовах фактычнага раздваення польскай грамадскай свядомасці, калі разам з дэмакратызмам, юрыдычным прызнаннем правоў няпольскага

насельніцтва выразнымі сталі вялікадзяржаўны шавінізм і нацыяналістычнае разуменне рэчаіснасці, склаліся сацыяльна-псіхалагічныя перадумовы для практычнага прымянення менавіта нацыянал-дэмакратычнага праекта.

На працягу 1926–1934 гг. нацыянальна-культурная палітыка польскіх улад была супярэчлівай. Прадэклараваныя рэжымам "санацыі" змены ў нацыянальнай палітыцы (замест палітыкі нацыянальнай асіміляцыі – палітыка дзяржаўнай асіміляцыі) азначалі адыход ад папярэдняга канфрантацыйнага нацыянал-дэмакратычнага праекта. Аднак у рэальнай практыцы змены не набылі сутнаснага характару, вызначаліся больш памяркоўнымі, завуаліраванымі метадамі рэалізацыі. Пасля непрацяглага і эпізадычнага выкарыстання элементаў кансерватыўнага і асабліва ліберальна-дэмакратычнага праектаў з канца 1920-х гг. адбылося фактычнае вяртанне да папярэдняй палітыкі нацыянальнай асіміляцыі. На гэта паўплываў цэлы шэраг фактараў – палітычныя (узмацненне аўтарытарнай, недэмакратычнай тэндэнцыі ва ўнутранай палітыцы Польшчы; уплыў нацыянальна-вызваленчага руху, які ў польскай грамадскай свядомасці ўспрымаўся ў якасці штучнага, інспіраванага з усходу), сацыяльна-эканамічныя (абвастрэнне сацыяльнай напружанасці, асабліва пад уплывам сусветнага эканамічнага крызісу), этнапсіхалагічныя (агульнапольскі патрыятычны ўздым, які суправаджаўся пашырэннем нацыяналістычных настрояў) і інш. Канфрантацыйнага характару нацыянальна-культурных інтарэсаў палякаў, як тытульнага этнасу ў Польскай дзяржаве, і беларусаў, як большасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі, пераадолець не ўдалося.

Ніякія элементы аўтаноміі, у тым ліку нацыянальна-культурнай, на тэрыторыі Заходняй Беларусі не ўводзіліся. Адносіны да нацыянальных супольнасцей выпрацоўваліся ў залежнасці ад іх колькасці, нацэленасці на дасягненне ўласнай дзяржаўнасці, атрыманне адпаведнага прававога статусу ў межах Польшчы, узроўню нацыянальнай свядомасці. Улічваючы тое, што беларусы складалі пераважную большасць сярод насельніцтва і выразна праяўлялі сваю волю да ўз'яднання ў межах адзінага дзяржаўна-палітычнага ўтварэння (г. зн. БССР), то польскія ўлады разглядалі іх інтарэсы выключна праз прызму антыдзяржаўнай, падрыўной дзейнасці. Яны недаацэньвалі важнасць беларускага пытання, прызнавалі яго ў якасці рэгіянальнага, а не агульнадзяржаўнага.

Асіміляцыйны характар насіла палітыка польскіх улад і адносна рускіх, украінцаў, літоўцаў. Наяўнасць рускіх трактавалі вынікамі папярэдняй палітыкі русіфікацыі царызму. Выкарыстоўваючы элементы рэгіяналізму, уладныя структуры істотна абмяжоўвалі грамадскую актыўнасць украінцаў на тэрыторыі Палескага ваяводства. Вырашэнне літоўскай праблемы ставілася ў прамую залежнасць ад урэгулявання міждзяржаўных польска-літоўскіх адносін. Пэўная этнаканфесіянальная адасобленасць яўрэяў не давала шансаў для іх паспяховай асіміляцыі, таму выкарыстоўваўся цэлы шэраг абмежавальных мер, асабліва іх эміграцыя.

Прывілеяваны сацыяльны статус палякаў прадвызначыў іх больш высокі матэрыяльны дастатак, што забяспечвала лепшыя магчымасці для атрымання

адукацыі, карыстання паслугамі ўстаноў культуры. Адначасова польскі этнас абавязваўся ажыццявіць на практыцы культурна-цывілізацыйную місію на заходнебеларускіх землях. Пры наяўнасці нявырашаных сацыяльна-эканамічных, нацыянальных і канфесіянальных праблем вышэйшы статус палякаў ствараў спрыяльную аснову для пашырэння адчужэння ў іх узаемаадносінах з няпольскім насельніцтвам, у тым ліку і ў грамадска-культурнай сферы. Інтарэсы польскіх землеўладальнікаў (памешчыкаў, асаднікаў) ішлі насуперак спадзяванням беларускай сялянскай большасці. Напружаная маральна-псіхалагічная атмасфера дапаўнялася мэтанакіраванай нацыянальнай палітыкай польскіх улад, накіраванай на прыярытэтнае развіццё выключна польскай культуры і асветы.

Польская нацыянальна-культурная палітыка была асіміляцыйнай і абмежавальнай адносна ўсіх этнічных супольнасцей заходнебеларускіх зямель, аказвала дэзінтэграцыйнае ўздзеянне на іх кансалідацыю. Пры правядзенні асіміляцыі беларусаў, усходнеславянскіх супольнасцей (рускіх, украінцаў), літоўцаў улічваліся іх колькасныя паказчыкі, нацэленасць на дасягненне ўласнай дзяржаўнасці (беларусы выразна праяўлялі сваю волю да ўз'яднання ў межах адзінага дзяржаўна-палітычнага ўтварэння – БССР), прававы статус у межах Польскай дзяржавы, узровень нацыянальнай свядомасці. Так як прысутнасць рускай культуры трактавалася ўплывам папярэдняй нацыянальнай палітыкі царызму, то адносна яе носьбітаў прымянялася дэрусіфікацыя і паланізацыя. Пры выкарыстанні элементаў рэгіяналізму нацыянальна-культурнае жыццё ўкраінцаў на заходнебеларускіх землях мэтанакіравана лакалізавалася ад пашырэння ўплыву заходнеўкраінскіх партый і арганізацый. Вырашэнне літоўскай праблемы ставілася ў непасрэдную залежнасць ад урэгулявання міждзяржаўных польска-літоўскіх адносін. Улічваючы этнаканфесіянальную адасобленасць яўрэяў, адносна іх выкарыстоўваліся абмежавальныя меры, паланізацыя і асіміляцыя прадугледжвалася толькі ў дачыненні да нязначнай іх часткі. Рэгіянальнай асаблівасці ў правядзенні нацыянальнай палітыкі адносна яўрэяў заходнебеларускіх зямель не было. Татарскае насельніцтва, якое афіцыйна не было прызнана нацыянальнай меншасцю, падлягала паланізацыі [3, с. 27].

З сярэдзіны 1930-х гг. у кіруючым лагеры пілсудчыкаў выразнымі сталі клерыкальныя, нацыяналістычныя і таталітарныя погляды, што адбілася і на нацыянальнай палітыцы. Заяву міністра замежных спраў Польшчы Ю. Бэка 13 верасня 1934 г. аб адмове польскага ўрада ад выканання міжнародных абавязацельстваў паводле Малога Версальскага трактата 1919 г. [7, с. 617] можна разглядаць у якасці своеасаблівага рубяжу ў пераходзе да больш радыкальных мер у вырашэнні нацыянальна-культурных праблем. Змест і характар нацыянальнай палітыкі другой паловы 1930-х гг. адпавядаў часткова ці нават поўнасцю тэарэтыка-ідэалагічным палажэнням (нават самым радыкальным) польскага нацыянал-дэмакратычнага праекта: разам з цэлым комплексам гвалтоўных мер (ліквідацыяй нацыянальных устаноў, арганізацый; жорсткім кантролем за грамадскім жыццём) адбывалася актывізацыя дзеянняў па ўзмацненні нацыянальна-культурнай асіміляцыі. Гэта было сведчаннем недастатковай выніковасці папярэдніх мер у напрамку паланізацыі і асіміляцыі няпольскага

насельніцтва (найперш беларусаў) і намераў істотна паскорыць гэтыя этнічныя працэсы ў бліжэйшай перспектыве.

Актывізацыя асіміляцыйных дзеянняў польскіх улад, з аднаго боку, сведчыла аб паскарэнні разбуральных этнічных працэсаў, з другога – аб недастатковай выніковасці папярэдніх (да сярэдзіны 1930-х гадоў) захадаў у напрамку паланізацыі і асіміляцыі беларусаў. Аб ступені нацыянальна-культурнай асіміляцыі беларускага насельніцтва, характары адносін паміж беларусамі і палякамі ў грамадска-культурнай сферы ў канцы 1930-х гг. сведчаць як статыстычныя матэрыялы, так і асабліва працы польскіх вучоных, архіўныя крыніцы. Паводле этнасацыялагічных даследаванняў С. Віславуха, фармальна задэклараваны ў ходзе перапісу насельніцтва 1931 г. польска-беларускі характар тэрыторыі паміж Вільняй і Ашмянамі не пацвердзіўся. У якасці роднай мовы мясцовае каталіцкае насельніцтва называла беларускую ці "простую". Польскую мову таксама выкарыстоўвалі, асабліва моладзь. Даследаванне С. Віславуха паказала, што праваслаўныя беларусы ў вёсках аказаліся больш устойлівымі да паланізацыі, яны актыўна цягнуліся да беларускай культуры. У пераважна праваслаўных мясцовасцях 6 паўночна-ўсходніх і ўсходніх паветаў Віленскага ваяводства вынікі паланізацыі ім зафіксаваны ў 15–20 % мясцовасцей, размешчаных каля гарадоў [15, с. 17–18, 37–40, 58–61]. На астатняй тэрыторыі больш трывалыя пазіцыі належалі беларускаму культурна-моўнаму асяроддзю.

Імкненне да захавання нацыянальнага культурна-моўнага асяроддзя на нізавым узроўні адзначыў у сваіх назіраннях сакратар ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнка пасля паездак па заходнебеларускіх землях у верасні 1939 г.: "крестьяне говорят на настоящем белорусском языке" [цыт. паводле: 1, с. 105].

Такім чынам, нацыянальна-культурная палітыка Польшчы не прывяла да поўнай асіміляцыі і паланізацыі беларусаў (такая яе ацэнка была манапольнай у беларускай савецкай гістарычнай навуцы, а таксама захоўваецца ў працах асобных сучасных беларускіх гісторыкаў). Пры гэтым нельга яе і ідэалізаваць, адлюстроўваць у якасці своеасаблівага дабратворнага фактара для заходнебеларускага нацыянальнага адраджэння на фоне параўнання са складанымі грамадска-палітычнымі, сацыяльна-эканамічнымі працэсамі 1930-х гг. ва ўсходняй (савецкай) частцы Беларусі (услед за польскімі, заходнімі даследчыкамі такі падыход назіраецца і ў некаторых сучасных беларускіх гісторыкаў, публіцыстаў). Пры захаванні і ўзмацненні ролі дзяржаўных і іншых сацыяльных інстытутаў Польшчы, а таксама пры гіпатэтычнай ўмове прагрэсіўнага развіцця Заходняй Беларусі ў гаспадарчай, сацыяльна-культурнай сферах жыццядзейнасці асіміляцыйныя працэсы павінны былі ў бліжэйшай перспектыве набыць канчатковы, незваротны характар. Аднак у канцы 1930-х гг., нягледзячы на ліквідацыю польскімі ўладамі арганізаваных сацыяльна-палітычных структур, беларускае насельніцтва ўсё-такі на нізавым узроўні працягвала захоўваць этнаканфесіянальныя традыцыі, мову, здольнасць да абароны ўласных сацыяльных і нацыянальных правоў.

1. Вабішчэвіч, А.М. Беларусізацыя ў заходніх абласцях Беларусі ў 1939–1941 гг. / А.М. Вабішчэвіч // Роднае слова. – 2003. – № 9. – С. 105–108.

2. Вабішчэвіч, А.М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А.М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2008. – 319 с.

3. Вабішчэвіч, А.М. Нацыянальна-культурнае жыццё ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … д-ра гіст. навук : 07.00.02 / А.М. Вабішчэвіч ; БДУ. – Мінск, 2010. – 52 с.

4. Палуян, У.А. Беларуская сялянска-рабочая Грамада / У.А. Палуян ; АН БССР, Ін-т гісторыі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1967. – 224 с.

5. Рабышка, В.Э. Этнапалітычныя працэсы ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гадах : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / В.Э. Рабышка ; БДПУ імя М. Танка. – Мінск, 2004. – 22 с.

6. AAN. – Zespół 390. Akta Leona Wasilewskiego. – Sygn. 74. Польская палітыка адносна нацыянальных меншасцей. Палітыка адносна ўкраінцаў. Дакладныя запіскі, артыкулы, вытрымкі прэсы, карэспандэнцыя (1909, 1916–1930 гг.).

7. Białorusini // Sprawy narodowościowe. – 1934. – № 5–6. – S. 617–620.

8. Eberhardt, P. Struktura narodowościowa Polski północno-wschodniej w latach trzydziestych XX wieku / P. Eberhardt // Społeczeństwo białoruskie, litewskie i polskie na ziemiach pólnocno-wschodnich II Rzeczypospolitej (Białoruś Zachodnia i Litwa Wschodnia) w latach 1939–1941: materiały z konferencji naukowej, Warszawa, 24–26 listopada 1993 r. / Instytut studiów politycznych PAN; pod red. M. Giżejewskiej i T. Strzembosza. – Warszawa : ISP PAN, 1995. – S. 44–56.

9. Gursztyn, P. Białoruś i Białorusini w pracach Leona Wasilewskiego / P. Gursztyn // Białoruskie zeszyty historyczne. – Białystok : Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 2001. – № 15. – S. 52–62.

10. Konstytucja 17 marca 1921 r. – Warszawa : Drukarnia Polska, 1921. – 66 s.

11. Traktat między Głównemi Mocarstwami sprzymierzonemi i stowarzyszonemi a Polską podpisany w Wersalu 28 czerwca 1919 r. ratyfikowany ustawą z dnia 31 lipca 1919 r. // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1920. – № 110. – Poz. 728.

12. Traktat pokoju // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1920. – № 35. – Poz. 200.

13. Ustawa konstytucyjna z dnia 23 kwietnia 1935 r. – Warszawa, 1935. – 51 s.

14. Ustawa z dnia 15 kwietnia 1921 r. o ratyfikacji Traktatu Pokoju między Polską a Rosją i Ukrainą, podpisanego w Rydzie dnia 18 marca 1921 r. // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1921. – № 49. – Poz. 300.

Wysłouch, S. Polacy i białorusini-katolicy na terenie Wileńszczyzny / S. Wysłouch. – Warszawa : IBSN, 1938. – 61 s.

УДК 323.15(437)(=112.2)(091)
**И.В. Вашкевич,** Беларусь, БГУИР

## ПРОБЛЕМА НЕМЕЦКОГО НАЦИОНАЛЬНОГО МЕНЬШИНСТВА В МЕЖВОЕННОЙ ЧЕХОСЛОВАКИИ (20–30-е гг. XX в.)

28 октября 1918 г. была провозглашена Чехословацкая республика (ЧСР). Государство изначально было многонациональным. По данным переписи 1921 г. в нем проживало 13 млн. 613 тыс. человек чешской, словацкой, немецкой, венгерской, русской, еврейской, румынской, цыганской и других